**Журнал Белорусского государственного университета. Филология. 2018;3:38–48**
**Journal of the Belarusian State University. Philology. 2018;3:38–48**

*УДК 821.161.3*

# РОМАНЫ ВЛАДИМИРА КОРОТКЕВИЧА В ИСТОРИКО-ЛИТЕРАТУРНОМ КОНТЕКСТЕ 1960–80-х гг.

***М. С. ЛАППО***[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

Рассматриваются романы В. Короткевича в историко-литературном контексте 1960–80-х гг. Дана характеристика развитию литературного процесса в Беларуси в указанный период. В общих чертах анализируются работы критиков, историков и литературоведов о романах В. Короткевича, написанные в 1960–80-х гг. Показано, что первый этап творчества В. Короткевича (1960–70-е гг.) был отмечен неоднозначной реакцией рецензентов на его романы. Позже статус писателя трансформируется в более «признанный», а работы, посвященные романам, переходят из оценочной плоскости (принятие/непринятие) в литературоведческую и аналитическую. Отмечается новаторство тематики, проблематики, стиля произведений В. Короткевича в контексте развития белорусского романа как жанра. Сделан акцент на такой черте прозы В. Короткевича, как жанровый и стилистический синтетизм. Обращается внимание на то, что проблемно-тематическое отличие романов писателя от белорусской советской прозы того времени обусловлено обращением писателя к концептуализированному показу исторических событий и проблеме национального самосознания.

***Ключевые слова:*** романы В. Короткевича; история белорусской литературы 1960–80-х гг.; литературная критика; жанровый синтетизм; авторский стиль; исторический роман; национальное самосознание.

# РАМАНЫ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА Ў ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫМ КАНТЭКСЦЕ 1960–80-х гг.

***М. С. ЛАППО***[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Разглядаюцца раманы У. Караткевіча ў гісторыка-літаратурным кантэксце 1960–80-х гг. Дадзена характарыстыка развіцця літаратурнага працэсу ў Беларусі ў адзначаны перыяд. Аналізуюцца работы крытыкаў, гісторыкаў і літаратуразнаўцаў 1960–80-х гг. пра раманы У. Караткевіча. Паказана, што першы этап творчасці пісьменніка (1960–70-я гг.) характарызуецца неадназначнай рэакцыяй крытыкаў на яго раманы. У наступны перыяд статус У. Караткевіча трансфармуецца ў больш «прызнаны», а работы, прысвечаныя раманам, пераходзяць з ацэначнай плоскасці (прыняцце/непрыняцце) у аналітычную і літаратуразнаўчую. Адзначаецца наватарства тэматыкі, праблематыкі, стылю твораў У. Караткевіча ў кантэксце развіцця беларускага рамана як жанру. Заўважана, што вызначальнай прыкметай прозы пісьменніка з'яўляецца жанравы і стылявы сінтэтызм. Падкрэсліваецца, што праблемна-тэматычнае адрозненне раманаў У. Караткевіча ад тагачаснай беларускай савецкай прозы абумоўлена зваротам пісьменніка да канцэптуалізаванага паказу гістарычных падзей і ўвагай да пытання нацыянальнай самасвядомасці.

***Ключавыя словы:*** гісторыя беларускай літаратуры 1960–80-х гг.; раманы У. Караткевіча; літаратурная крытыка; жанравы сінтэтызм; аўтарскі стыль; беларускі гістарычны раман; нацыянальная самасвядомасць.

**Образец цитирования:**
Лаппо МС. Раманы Уладзіміра Караткевіча ў гісторыка-культурным кантэксце 1960–80-х гг. *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Філалогія*. 2018;3:38–48.

**For citation:**
Lappo MS. The novels of Uladzimir Karatkevich in the 1960–80s (critical assessment, genre and style innovation). *Journal of the Belarusian State University. Philology.* 2018;3:38–48. Belarusian.

**Автор:**
***Мария Сергеевна Лаппо*** – аспирантка кафедры истории белорусской литературы филологического факультета. Научный руководитель – кандидат филологических наук, доцент А. Л. Воробей.

**Author:**
***Maryia S. Lappo***, postgraduate student at the department of history of Belarusian literature, faculty of philology.
*masha.lappo@gmail.com*

# THE NOVELS OF ULADZIMIR KARATKEVICH IN THE 1960–80s (CRITICAL ASSESSMENT, GENRE AND STYLE INNOVATION)

*M. S. LAPPO* [a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliežnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

The article is devoted to the novels of U. Karatkevich in the literary-historical context of the 1960–80s, taking into account the characteristics of the literature development process in Belarus. The first part of the article deals with the literature development process in the specified period and with the reviews and analytical works written about the U. Karatkevich's novels in the 1960–80s. The first stage of the U. Karatkevich's literary career (1960–70s) is characterized by the ambiguous researchers' reaction to the novels. Later the writer's status has transformed into a more «recognized» and «authoritative»; and works about the novels have changed from the evaluation (acceptance/non-acceptance) to the analysis (analysis of the writer's style, comparative and culturological research). The second part of the article is about the theme and style innovations of the U. Karatkevich's novels in the context of the Belarusian prose development. It is stressed that the distinguishing feature of the novels is genre and stylistic synthetism. The main innovation of U. Karatkevich's works is connected with the author's decision to present conceptualized events of Belarusian history, not the realities of the XX century.

***Key words:*** the novels of U. Karatkevich; history of Belarusian literature of the 1960–80s; literary ctiticism in Belarus; synthesis of genres; author's style; historical novel; national identity.

## Грамадска-палітычныя ўмовы развіцця беларускай літаратуры ў 1960-я – пачатку 1980-х гг.

Паводле выдання «Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя», падрыхтаванага Інстытутам літаратуразнаўства імя Янкі Купалы, у 1960-я – першай палове 1980-х гг. беларуская літаратура развівалася ў супярэчлівых умовах [1; 2].

Перыяд з другой паловы 1950-х да сярэдзіны 1960-х гг. вядомы як час палітычнай адлігі і развенчвання культу асобы Сталіна. Аднак да канца 1980-х гг. грамадска-літаратурнае жыццё па-ранейшаму, прынамсі фармальна, падпарадкоўвалася патрэбам дзяржаўна-партыйнай палітыкі: «Знешне актыўнае, часамі дзесьці, магчыма, мітуслівае, вызначалася яно, праграмавалася і стымулявалася зверху. <…> …у рашэннях усіх партыйных з'ездаў, што праходзілі ў "пасляадліжны" час (а гэта XXVII–XXX з'езды Кампартыі Беларусі), заўсёды ўдзялялася вялікая ўвага пытанням развіцця літаратуры і мастацтва. <…> Пісьменніцкія з'езды (якія адбываліся адразу пасля партыйных)… праходзілі шмат у чым парадна і абавязкова "ў святле рашэнняў" адпаведнага з'езда партыі» [2, с. 9]. Правядзенне ўсіх тагачасных літаратурных канферэнцый і сімпозіумаў мусіла ўзгадняцца ў ЦК КПБ. Пасады, звязаныя з літаратурнай дзейнасцю (кіраўніцтва Саюза пісьменнікаў БССР, выдавецтваў, перыядычных выданняў), таксама зацвярджаліся ў ЦК. Там жа вырашаўся лёс складаных і супярэчлівых твораў.

Уладзімір Караткевіч не быў актыўным грамадскім дзеячам, не займаў пасад у савецкай сістэме, пры гэтым ён браў удзел у асобных цікавых праектах – напрыклад, у камандзіроўцы пісьменнікаў на Урал па прапанове Усесаюзнага бюро прапаганды мастацкай літаратуры. Думаецца, пісьменнік не адмаўляў асветніцкай скіраванасці ідэй сацыялізму, але пры гэтым асуджаў культ асобы, пра што сведчыць праблематыка рамана «Леаніды не вернуцца да Зямлі», у дадатку да якога пісьменнік кажа: *Вайна і культ асобы. Дзве гэтыя праявы імкнуліся перарабіць нас па свайму вобразу і падабенству і… не здолелі зрабіць гэтага*[1] [3, с. 461].

Даследуючы становішча нацыянальнай інтэлігенцыі ў БССР, А. Лявіцкі адносіць У. Караткевіча да ліку «ўнутраных эмігрантаў», якія далучаліся да афіцыйнай культуры і фактычна працавалі на яе карысць, але ў той жа час выносілі за дужкі навязлівыя прынцыпы партыйнасці і сацрэалізму і працавалі ў межах уласнай «ідэалогіі» [4]. Варта дадаць, што магчымасць займець пэўную творчую свабоду з'явілася дзякуючы асаблівасцям развіцця самой палітычнай сістэмы, якая з 1960-х гг. пачала рух да свайго распаду.

## Раманы У. Караткевіча ў ацэнках крытыкаў, гісторыкаў і літаратуразнаўцаў у 1960-я – сярэдзіне 1970-х гг.

Пэўныя цяжкасці меў У. Караткевіч з выданнем сваіх першых раманаў: «Яго адметнае становішча сярод беларускіх пісьменнікаў шырока вядомае. Першы этап творчага шляху творцы (прыблізна 1958–1974 гг.) адзначаны непрыняццем з боку афіцыйных ідэолагаў, асуджэннем у друку яго твораў,

[1]Цытата прыведзена з захаваннем моўных асаблівасцей арыгінала. – *М. Л.*

якія займалі маргінальнае становішча ў беларускай савецкай літаратуры» [4]. У 1963 г. планавалася выданне кнігі У. Караткевіча «Леаніды не вернуцца да Зямлі», куды павінны былі ўвайсці аднайменны раман і аповесць «Дзікае паляванне караля Стаха», аднак праз абвінавачванні пісьменніка ў «абстрактным гуманізме» восенню 1963 г. яе набор быў рассыпаны.

Часопісная публікацыя рамана У. Караткевіча «Леаніды не вернуцца да Зямлі» (пад назвай «Нельга забыць») у 1962 г. атрымала негатыўную ацэнку ў артыкуле Я. Герцовіча «Пошукі, знаходкі, страты» (Звязда. 1962. 22 ліст.) і водгуку маскоўскага рэцэнзента В. Чалмаева (Дружба народов. 1962. № 9). Пісьменнік абвінавачваўся ў кніжнасці, другаснасці, фармалізме. Акрамя таго, В. Чалмаеў указваў на «пошлую банальнасць гісторыі» і «ўбогую філасофію маладога героя» (цыт. па: [5, с. 378]). Па сведчанні А. Мальдзіса, «артыкулы Я. Герцовіча і В. Чалмаева былі ўспрыняты не як выражэнне прыватнай думкі іх аўтараў, а як дырэктыўнае ўказанне», бо «ў краіне тады, у канцы 1962 года, узнялася хваля барацьбы з “фармалізмам”» [6, с. 20]. Аднак у друку з’явіліся рэцэнзіі і са станоўчай (ці пераважна станоўчай) ацэнкай рамана – артыкулы А. Мальдзіса «Права мастака» (Літаратура і мастацтва. 1962. 17 ліп.), Л. Брандабоўскай «Время, люди, верность» (Знамя юности. 1962. 2 окт.). Брытанскі філолаг-славіст А. Макмілін збольшага станоўча ацаніў твор, але разам з тым адзначыў і стылістычныя агрэхі ў рамане [7, с. 268]. Гэты твор У. Караткевіча выйшаў асобным выданнем толькі ў 1982 г. (як і ў часопіснай публікацыі, пад назвай «Нельга забыць»).

Пісьменнік меў цяжкасці з выданнем і наступнага рамана – «Каласы пад сярпом тваім» (1962–1964). Твор быў апублікаваны ў часопісе «Полымя» ў 1965 г. (№ 2–6), асобнай кнігай выйшаў у 1968 г. Пытанне пра яго выданне абмяркоўвалася на аб’яднаным пасяджэнні сакратарыята Саюза пісьменнікаў БССР 22 лютага 1967 г. У выніку, для таго каб раман надрукавалі, У. Караткевіч быў вымушаны прыняць заўвагі крытыкаў і значна скараціць твор.

Адмоўнае стаўленне да рамана адлюстравана ў рэцэнзіі Я. Герцовіча «Лёсы чалавечыя і лёсы народныя», якая, як адзначае А. Верабей, вылучалася «сацыялагічнай зададзенасцю і дагматызмам» [8, с. 132]. Пры гэтым раман прыхільна сустрэлі многія іншыя крытыкі, а галоўнае – чытачы. Хоць у водгуках крытыкаў і адзначаліся некаторыя хібы твора (напрыклад, М. Ермаловіч казаў аб празмернай публіцыстычнасці рамана: «Часам нават здаецца, што Караткевіч-публіцыст бярэ верх над Караткевічам-мастаком»[2] [9, с. 169]), але ў цэлым ён ухваляўся і высока ацэньваўся. Агульнае меркаванне крытыкаў можа быць выражана ў словах Г. Кісялёва, які ў прадмове да рускамоўнага выдання ў 1979 г. рэзюмаваў: «…пісьменнік не толькі пасадзейнічаў прыкметнаму пашырэнню тэматыкі роднай літаратуры, – ён можа лічыцца сапраўдным заснавальнікам беларускай савецкай гістарычнай раманістыкі: ніхто не зрабіў для яе так шмат, як ён, ні для каго вобласць гістарычнага рамана не з’яўляецца настолькі арганічнай, як для яго» [10, с. 9].

Маючы на ўвазе негатыўныя водгукі на творы У. Караткевіча, П. Банцэвіч ахарактарызаваў стаўленне да творчасці пісьменніка ў 1960–70-х гг. наступным чынам: «Значную частку работ пра творчасць У. Караткевіча перыяду 60–70-х гадоў складаюць газетныя публікацыі, якія нясуць след вульгарызатарскай сацыялагічнай крытыкі. <…> Не прымалася паглыбленне празаіка ў нацыянальную гісторыю, яго сцвярджэнне ідэі культурнай самабытнасці беларускага этнасу, бачанне беларусаў як народа еўрапейскага, які мае глыбокія этнічныя і культурныя карані. <…> Многія творы трактаваліся тэндэнцыйна, або не друкаваліся. <…> Як праявы абстракцыянізму ўспрымаліся творчыя пошукі мастака ў галіне зместу і формы, усё наватарскае і неардынарнае. Той жа Я. Герцовіч бачыў у творах У. Караткевіча элементарнае эпігонства. <…> У многіх рэцэнзіях адбівалася агульная атмасфера застойных часоў, калі рэальную гісторыю Беларусі нельга было аб’ектыўна тлумачыць, або даводзілася пісаць намёкамі» [11, с. 26–28].

Паэзія, авантуры, каханне, гісторыя з’яўляюцца ў творах У. Караткевіча куды больш значнымі складнікамі, чым «аб’ектыўнае» адлюстраванне падзей 1960-х гг., і менавіта праз гэта на пісьменніка сыпаліся абвінавачванні ў «рамантызме» (які ў прыведзеным кантэксце становіцца сінанімічным «адарванасці ад жыцця»), «абстрактным гуманізме», а таксама ў эпігонстве.

Да абвінавачванняў у эпігонстве хацелася б звярнуцца асобна, узяўшы ў якасці прыкладу раман «Каласы пад сярпом тваім» – класічны ўзор гістарычнага рамана вальтэр-скотаўскага тыпу, папулярнага ў заходнееўрапейскай і рускай літаратуры ў XIX ст. Сапраўды, У. Караткевіч не хаваў таго, што арыентаваўся на адпаведныя літаратурныя ўзоры (творы В. Скота, Г. Сянкевіча і інш.), але ці можа гэта быць падставай для прэтэнзій? Па-першае, гістарычны раман такога тыпу, як правіла, з’яўляецца ў пэўнай нацыянальнай літаратуры падчас актыўных нацыятворчых працэсаў, і калі ў краінах Заходняй Еўропы гэтыя працэсы адбываліся ў XIX ст., то ў Беларусі яны праходзілі толькі ў XX ст. (У. Караткевіч у некаторым сэнсе нават апярэдзіў гэты працэс, бо станаўленне дзяржавы на нацыянальнай аснове ад-

[2]Тут і далей пераклад наш. – *М. Л.*

былося толькі ў 1990-х гг., а творы У. Караткевіча друкаваліся ў 1960–80-х гг.). Па-другое, нягледзячы на тое, што пісьменнік «пазычае» форму, ён напаўняе яе цалкам арыгінальным мясцовым матэрыялам – і гэта механізм, у адпаведнасці з якім развіваецца большасць еўрапейскіх літаратур. Як адзначае Ф. Марэці, «у культурах, якія знаходзяцца на перыферыі літаратурнай сістэмы (гэта значыць, амаль ва ўсіх культурах як у Еўропе, так і за яе межамі) раман сучаснага тыпу ўзнікае не як самастойнае вынаходніцтва, а як кампраміс паміж заходнімі фармальнымі ўплывамі (як правіла, французскімі ці англійскімі) і мясцовым матэрыялам» [12, с. 85]. Адпаведна, пад такое вызначэнне савецкіх крытыкаў можна было б залічыць і большасць сусветна вядомых пісьменнікаў, у тым ліку Г.-Г. Маркеса, на якога, як вядома, паўплываў стыль Ф. Кафкі. Але творчасць У. Караткевіча не мае нічога агульнага з эпігонствам, у якім няма арыгінальнага зместу, а ёсць толькі механічнае капіраванне формы.

Выданне двух наступных раманаў У. Караткевіча – «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» (1965–1966; на беларускай мове выдадзены ў 1972 г.) і «Чорны замак Альшанскі» (1979) – ужо не выклікала праблем, а самі творы не атрымалі такіх рэзка крытычных водгукаў, як першыя вялікія празаічныя творы пісьменніка. Гэта можа сведчыць пра некалькі тэндэнцый: па-першае, да таго часу У. Караткевіч набыў вядомасць у літаратурным асяродку і сапраўды эвалюцыяніраваў як пісьменнік; па-другое, змяніўся грамадска-палітычны клімат, і беларускі літаратурны працэс паступова пачынаў вызваляцца ад ідэалагічнага прэсінгу, хоць ціск на творцаў у той ці іншай ступені адчуваўся і пазней. Напрыклад, А. Мальдзіс, апісваючы падзеі сярэдзіны 1980-х гг., згадваў наступнае: «У лютым 1984 года, пасля смерці Ю. А. Андропава, калі яшчэ было невядома, куды пойдзе далейшае развіццё краіны, па Беларусі пракацілася, як вызначыў Валодзя, “непамысная хваля высакоснага года”. Выступаючы на семінары ў Гродне, работнік Галоўліта БССР В. Пепяляеў ахарактарызаваў Караткевіча, Адамовіча, мяне, а заадно чамусьці і Думбадзэ ледзь не як ворагаў народа. Рашыўшы, што настаў яго зорны час, адзін з пісьменнікаў стаў пісаць у высокія інстанцыі палітычныя даносы. Усё гэта вельмі расстроіла Караткевіча. Пасля званка з Гродна пра тое, што гаварылася на тым семінары, ён рашыў (казаў пра гэта мне ў бальніцы), што зноў вяртаецца “сталіншчына”» [6, с. 161].

## Ацэнка раманаў У. Караткевіча ў працах літаратуразнаўцаў сярэдзіны 1970-х – пачатку 1990-х гг. і праблема вызначэння яго творчага метаду

З сярэдзіны 1970-х гг. разгляд раманістыкі У. Караткевіча перайшоў з ацэначнай плоскасці ў аналітычную, даследчую. У гэты час у зборніку «Беларускае літаратуразнаўства» выйшла праца Л. І. Прашковіч «Аб жанрава-стылістычных асаблівасцях рамана У. Караткевіча “Хрыстос прызямліўся ў Гародні”» (1975). У 1980-я гг. былі апублікаваны станоўчыя рэцэнзіі на раман «Чорны замак Альшанскі» (1979): артыкулы М. Тычыны «Неабходнасць легенды» (Літаратура і мастацтва. 1980. 21 сак.), В. Шынкарэнка «Клопат пра будучыню» (Полымя. 1984. № 8). Аўтары адзначалі наватарства У. Караткевіча ў распрацоўцы гісторыка-дэтэктыўнага жанру. У навуковым зборніку «Беларуская літаратура» ў 1985 г. выйшаў артыкул В. Шынкарэнка «Жанравыя асаблівасці рамана У. Караткевіча “Хрыстос прызямліўся ў Гародні”». У гэтым жа годзе пабачыла свет манаграфія А. Вераб’я «Жывая повязь часоў» – першае грунтоўнае літаратуразнаўчае даследаванне творчасці У. Караткевіча. У аснове працы – гісторыка-біяграфічны падыход з элементамі ідэйна-тэматычнага аналізу твораў. Прозе У. Караткевіча прысвечаны раздзел «Гармонія характва і праўды».

Характарызуючы крытычныя артыкулы на творы У. Караткевіча, П. Банцэвіч сцвярджае, што ў 1980-х гг. «выходзіла шмат публікацый, дзе адзначаліся літаратурны талент У. Караткевіча, надзённасць пастаўленых ім праблем, падкрэсліваўся грамадзянскі і гуманістычны пафас твораў, бязмежная вера аўтара ў магчымасць удасканалення чалавека, у магутнасць розуму» [11, с. 28]. Аднак пры гэтым, на думку П. Банцэвіча, літаратуразнаўцы яшчэ адчувалі ўплыў сацрэалізму, што выяўлялася, напрыклад, у прыпісванні У. Караткевічу рэалістычнага метаду [11, с. 28]. Такога ж меркавання прытрымліваецца Д. Бугаёў, які ў артыкуле «Рамантычны рыцар чалавечнасці» кажа, што словы А. Мальдзіса і А. Вераб’я пра спалучэнне ў пісьменніка рамантычнага светаўспрымання з глыбока рэалістычным разуменнем рэчаіснасці – гэта «ўступка сацрэалістычнай дагматыцы» [13].

У даследаваннях апошніх гадоў некаторыя аўтары выказваюць нязгоду з такой ацэнкай. Так, В. Навіцкая настойвае на прысутнасці рэалістычнага пачатку ў творчасці У. Караткевіча і прыводзіць у падтрымку свайго меркавання некалькі аргументаў: па-першае, як адзначае даследчыца, у прыватным жыцці У. Караткевіча адбываліся падзеі, якія трансфармавалі творчы метад пісьменніка ў «больш рэалістычным» напрамку (у пацвярджэнне аўтар цытуе ліст У. Караткевіча да Я. Брыля: *І сам я стаў іншым, і апавяданні цяпер буду пісаць не так. Быццам адзін памёр, а другі нарадзіўся* (цыт. па: [14, с. 229])); па-другое, «нават на раннім этапе рэалізацыі свайго прыроднага таленту У. Караткевіч пры ўсёй сваёй рамантычнай узнёсласці… быў моцна прывязаны да рэальнай, прадметнай канкрэты-

кі» [14, с. 230]. Акцэнтуючы ўвагу на прывязанасці У. Караткевіча да «прадметнай канкрэтыкі», даследчыца такім чынам паўтарае тэзісы А. Мальдзіса і А. Вераб'я, настойваючы на іх абгрунтаванасці.

Калі А. Мальдзіс, А. Верабей, В. Навіцкая гавораць пра спалучэнне рамантычнага і рэалістычнага пачаткаў у творчасці У. Караткевіча, яны, верагодна, больш імкнуцца абараніць пісьменніка ад ярлыка рамантызму наогул. Сам У. Караткевіч не прымаў гэтага вызначэння, а рамантызм займеў трывалую асацыяцыю з легкадумным капіраваннем несучасных літаратурных форм і адарваным ад жыцця фантазіраваннем. Адмаўляючы рамантызм як свой творчы метад у інтэрв'ю 1982 г., У. Караткевіч адзначаў: «Я апісваю незвычайныя, але цалкам рэальныя падзеі. <…> Але пагадзіцеся: жыццё іншы раз выкідвае такія штучкі, што насамрэч бывае цяжка паверыць у тое, што адбылося. Таму абгрунтавана лічу: напісанае мной ёсць не што іншае, як рэалізм» [15, с. 214]. Відавочна, у дадзеным выпадку У. Караткевіч гаворыць пра літаратурны напрамак зыходзячы не з тэрміналагічнай дэфініцыі, а, хутчэй, з уласнага разумення рамантычнага і рэалістычнага.

Творчасць У. Караткевіча цяжка аднaзначна аднесці да рэалістычнага або рамантычнага метаду. Рэалізм мае на мэце «аб'ектывізаваны» паказ рэчаў, узнаўленне тыповых вобразаў у тыповых абставінах, і асобныя фрагменты раманаў У. Караткевіча (напрыклад, апісанні побыту) можна назваць рэалістычнымі. Але ідэйна-змястоўную значнасць у раманах пісьменніка маюць фрагменты, тыповыя для рамантычных твораў: у іх выражаецца імкненне галоўных герояў пераўладкаваць рэчаіснасць у адпаведнасці з пэўнымі ідэаламі або прысутнічае ярка выражаны аўтарскі пачатак. Аднак тут таксама ўзнікае складанасць: ці можа наогул тэрмін «рамантызм», які звычайна звязваецца з літаратурай XIX ст., прымяняцца ў дачыненні да творчасці пісьменніка XX ст.? Вырашаючы гэту праблему, даследчыца Т. Мацюхіна адносіць творчасць У. Караткевіча да «неарамантызму» [16], А. Сцяпанава піша пра «постмадэрнісцкую» манеру пісьма У. Караткевіча [17]. На фармальным узроўні творчы метад пісьменніка сапраўды мае некаторыя рысы постмадэрнізму, такія як актыўная цытацыя і інтэртэкстуальнасць, змяшэнне «высокай» і «нізкай» культур.

Такім чынам, з 1970-х гг. і да нашага часу творчы метад пісьменніка атаясамліваўся з рознымі літаратурнымі напрамкамі (рамантызм, спалучэнне рамантызму і рэалізму, неарамантызм, постмадэрнізм). Для таго каб разабрацца ў складанасцях, звязаных з праблемай вызначэння творчага метаду пісьменніка, трэба ўлічваць не толькі тэарэтычнае азначэнне напрамкаў, але таксама ідэалагічны ўплыў і культурны кантэкст, у якім рабіліся ацэначныя меркаванні крытыкаў і літаратуразнаўцаў. Відавочна, стыль У. Караткевіча сапраўды цяжка «падвесці» пад адзін з названых напрамкаў. Магчыма, варта гаварыць пра дамінанты або прыкметы пэўнага стылявога напрамку ў творчасці У. Караткевіча.

У пачатку 1990-х гг., пасля распаду Савецкага Саюза, актуалізавалася пытанне нацыянальнага самавызначэння беларусаў і атрымалі распаўсюджанне ідэі нацыянальнага адраджэння. На гэтай хвалі ўзмацнілася цікавасць да творчасці У. Караткевіча, змяніўся погляд на яго асобу. Як адзначае П. Банцэвіч, пісьменнік «вырас» да ўзроўню нацыянальнага прарока [11, с. 31], а яго творы былі ўключаны ў школьную праграму.

Бачна, што У. Караткевіч прайшоў шлях ад непрымання да ўхвалення і легітымацыі яго твораў на дзяржаўным узроўні. Пры гэтым, нягледзячы на зменлівае стаўленне з боку крытыкаў, на працягу ўсяго свайго творчага шляху ён меў прыхільнасць чытача. Так, у інтэрв'ю з пісьменнікам у 1980 г. Г. Якаўлева адзначае: «Без перабольшання можна сказаць, што Уладзімір Караткевіч – адзін з найбольш чытаемых аўтараў не толькі ў Беларусі, але і ў Савецкім Саюзе. Аднойчы маскоўскае выдавецтва "Молодая гвардия" падводзіла вынікі года на падставе апытання саміх чытачоў. Найбольшую колькасць пісем выклікалі творы беларускага пісьменніка Караткевіча» [18, с. 208].

## Наватарства твораў У. Караткевіча ў кантэксце развіцця беларускага рамана

Раманы У. Караткевіча, адметныя праз сваё тэматычнае непадабенства да іншых твораў беларускай літаратуры ў 1960-х гг., наводзяць на думку пра тое, што аўтар працаваў як быццам бы адасоблена ад акаляючай яго рэчаіснасці. У пэўнай ступені гэта сапраўды так, што пацвярджаюць словы С. Навумчыка: «Пра гэтага чалавека ходзяць легенды. <…> Расказваюць, што калі Караткевіч жадае нешта пісаць, то зачыняецца ў пакоі, не падыходзіць да тэлефона, а праз два-тры тыдні ўжо нясе новую рэч у выдавецтва. Расказваюць яшчэ шмат чаго, але гэта, напэўна, вынік вялікай папулярнасці і часткова – таго ладу жыцця, які ён вядзе. Караткевіча зрэдку сустрэнеш на пісьменніцкім сходзе, ён надзвычай рэдка дае інтэрв'ю, на афіцыяльных урачыстасцях яго таксама нячаста ўбачыш» [19]. Падобная пазіцыя – супрацьстаянне любой уладзе як такой, імкненне захаваць незалежнасць думкі і мастацкай ідэі і не паддавацца часовым уплывам – патрэбная ў той ці іншай ступені кожнаму мастаку. Руска-амерыканскі даследчык сучаснага мастацтва Б. Гройс апісвае гэта наступным чынам: «Цягам доўгага часу сённяшнія мастакі змагаліся

супраць ідэнтычнасцей, што навязваліся ім з боку іншых – грамадства, школы, бацькоў і г. д., – за права суверэннай самаідэнтыфікацыі. Яны падманвалі чаканні, звязаныя з грамадскай роляй мастацтва, прафесіяналізмам мастака і эстэтычнай якасцю твора мастацтва, а таксама падрывалі нацыянальныя і культурныя ідэнтычнасці, якія ім прыпісваліся» [20].

У выніку імкнення У. Караткевіча захаваць сваю незалежнасць яго творчасць стала сапраўды нетыповай у кантэксце тагачаснай беларускай савецкай літаратуры. Як адзначае А. Лявіцкі, выключна папулярныя раманы Караткевіча «былі выразна адчужаныя калі не ад эстэтыкі, то ад праблематыкі астатняй часткі беларускай сацрэалістычнай літаратуры. <…> …творчы даробак пісьменніка справядліва характарызуецца як “нестандартны” на агульным фоне» [4]. Такая «нестандартнасць» творчасці выяўлялася ў шэрагу характэрных рыс. Разгледзім найбольш важныя з іх.

***Сінтэз жанравых форм.*** У беларускай літаратуры У. Караткевіч лічыцца заснавальнікам жанру гістарычнага рамана ў духу еўрапейскіх традыцый. Аднак пры гэтым з усіх твораў пісьменніка толькі «Каласы пад сярпом тваім» можна назваць уласна гістарычным раманам, астатнія ж маюць сінтэтычную жанравую прыроду. На гэта ўпершыню звярнула ўвагу В. Шынкарэнка ў сваім літаратуразнаўчым даследаванні «Пад ветразем надзеі» (1995). Напрыклад, характарызуючы раман «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», даследчыца адзначала: «Гумар, сатыра, гратэск, лірызм, прыгодніцкія элементы – усё арганічна пераплялося ў мастацкай тканіне рамана, нарадзіўшы пры гэтым своеасаблівую форму, якая не ўкладаецца ў звыклую іерархію жанраў» [21, с. 159].

Такімі «сплавамі» розных жанрава-стылявых элементаў характарызуюцца і астатнія творы У. Караткевіча. Свой першы раман, «амаль што сентыментальны», як вызначыў яго сам аўтар, ён апісвае наступным чынам: «…твор шматпланавы, у пэўнай меры эксперыментальны. Гісторыя тут суседнічае з сучаснасцю, проза – з паэзіяй, лірыка – з жыццёвым сухім рэалізмам» [22, с. 225]. Сапраўды, вызначальнай адметнасцю рамана «Леаніды не вернуцца да Зямлі» з’яўляецца тое, што апісанні жыцця студэнтаў у маскоўскім інтэрнаце тут перамяжоўваюцца з паэмамі-ўстаўкамі, снамі, казкамі, рэтраспекцыямі – і ўсё гэта арганічна знітавана ў адзінае цэлае. «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», па вызначэнні аўтара, – «народная драма» [23, с. 10], трагікамедыя, і пры гэтым – травесція і гістарычны раман. «Чорны замак Альшанскі» – псіхалагічны дэтэктыў, які мае элементы гістарычнага рамана. «Каласы пад сярпом тваім» – гістарычны раман, аднак у пэўным сэнсе – таксама «эксперымент», бо, па-першае, у выбранай аўтарам форме «вальтэр-скотаўскага» рамана не меў папярэднікаў у беларускай літаратурнай традыцыі, па-другое, спалучае эпічнасць з лірыкай і публіцыстычнасцю.

Фактычна творы У. Караткевіча сталі першымі раманамі на беларускай мове, у якіх падобным чынам сумяшчаліся (або распрацоўваліся) названыя жанравыя формы.

***Героі.*** Галоўным персанажам савецкага рамана звычайна быў служачы, салдат, партыйны дзеяч. Пры гэтым многія беларускія літаратары, якія «адмаўляліся ствараць штучныя вобразы станоўчых партыйных і савецкіх функцыянераў, звярталіся да вясковых дзядоў і бабуль, якія нагараваліся і нацярпеліся, але захавалі сапраўды народную мараль і этыку» [1, с. 147]. У творах У. Караткевіча галоўнымі персанажамі з’яўляюцца студэнты, інтэлігенты («Чорны замак Альшанскі», «Леаніды не вернуцца да Зямлі»), дваране XIX ст. («Каласы пад сярпом тваім») ці нават артысты-махляры XVI ст. («Хрыстос прызямліўся ў Гародні»).

***«Нацыянальнае пытанне» як неад’емны элемент праблемна-тэматычнай скіраванасці раманаў.*** Беларускія празаікі ў 1960-х гг. не рабілі тэму нацыянальнага самавызначэння галоўным аб’ектам увагі (у адрозненне ад пісьменнікаў даваеннага перыяду, напрыклад М. Гарэцкага, які ў аповесці «Дзве душы» задаваўся пытаннямі пра тое, хто такі беларус і што такое – быць беларусам). У раманах У. Караткевіча праблемы нацыі і нацыянальнай самасвядомасці становяцца важнымі тэматычнымі складнікамі.

Галоўныя героі твораў пісьменніка ўсведамляюць сябе часткай беларускага народа, і пытанне яго гістарычнага лёсу мае для іх прынцыповае значэнне. У рамане «Каласы пад сярпом тваім» праблема нацыянальнага самавызначэння задае ідэйную скіраванасць твора. У рамане «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» асэнсоўваецца ўзаемасувязь асобы і народа: галоўны герой Юрась Братчык вырастае з махляра і прайдзісвета ў чалавека, які мае пачуццё ўласнай годнасці і пачынае адчуваць адказнасць за свой народ.

Ва ўсіх творах пісьменнік звяртае ўвагу на розныя падкрэслена нацыянальныя аспекты рэальнасці, напрыклад: *...Тыповы* ***беларускі*** *погляд на рэчы, – іранізуе Шаблыка. – Што за жыццё?.. Раніцай уставай, вечарам кладзіся, уставай – кладзіся, уставай – кладзіся. Во каб гэта лёг ды не ўстаў* (тут і далей вылучана намі. – *М. Л.*) [24, с. 152]; *Божа, такую размову з такой лаянкай можна пачуць ва ўсім свеце – ад Аляскі да Аўстраліі – толькі ў* ***беларускіх*** *аўтобусах і на нашых рынках, асабліва на Магілёўскім, Рагачоўскім, ну і яшчэ крыху на Слуцкім* [24, с. 103].

Аналізуючы творчасць У. Караткевіча, П. Банцэвіч адзначае наяўнасць у ёй «эстэтыкі Асветніцтва» [11]. Як вядома, Асветніцтва з'яўляецца «пунктам адліку» для перыяду мадэрну – часавага адрэзка з XVI да XX ст., на працягу якога сфарміравалася аблічча сучаснай еўрапейскай цывілізацыі. Паводле вызначэння Ж.-Ф. Ліятара, мадэрн уяўляе сабой культуру «вялікіх нарацый» («метанаратываў») – пэўных сацыякультурных дамінантаў, уладных установак, якія легітымізуюць той ці іншы тып рацыянальнасці. У якасці асноўных ідэй, што арганізуюць культуру мадэрну, згодна з пазіцыяй Ж.-Ф. Ліятара, выступаюць такія «вялікія гісторыі», як ідэя прагрэсу, ідэалы Асветніцтва, эмансіпацыя асобы, асветніцкае ўяўленне пра веды як сродак дасягнення шчасця і лепшага ўзроўню жыцця [25]. Менавіта такія ідэалы ў спалучэнні з нацыянальнай афарбоўкай з'яўляюцца каштоўнаснымі для галоўных герояў раманаў У. Караткевіча.

Многія савецкія раманы былі таксама скіраваны на ўхваленне ідэалаў мадэрну, але, як правіла, яны абапіраліся або на каштоўнасці, тэматычна звязаныя з сацыяльна-палітычнымі навацыямі ў грамадстве (лёс партыі, перамога працоўнага класа) – такія творы былі прасякнуты афіцыйнай ідэалогіяй; або на савецкія гуманістычныя каштоўнасці – раманы, скіраваныя на выкрыццё маральных заган грамадства (напрыклад, бюракратызму). Творы У. Караткевіча ў гэтым кантэксце вылучаліся зваротам да нацыянальных каштоўнасцей.

***Гістарычнае мінулае як аб'ект выяўлення.*** У 1960-х гг. пачалася новая хваля цікавасці пісьменнікаў да гістарычнай спадчыны. У савецкай сістэме адбываліся змены: афіцыйная рыторыка, якая абвясціла «новую гістарычную агульнасць людзей – савецкі народ», станавілася непераканаўчай для ўсё большай колькасці людзей. На гэтым фоне, як адзначае Б. Дубін [26, с. 35–36], актывізаваўся пошук нефальсіфікаванай гісторыі з боку дысідэнцтва.

У першай палове 1960-х гг. у беларускай літаратуры з'явіліся раманы «Засценак Малінаўка» А. Чарнышэвіча, «На парозе будучыні» М. Лобана, «Людзі на балоце» І. Мележа. Паводле В. Бароўка, новай для таго часу ў паказе беларускай рэчаіснасці А. Чарнышэвічам была думка пра тое, што Беларусь – гэта не толькі сялянскі, але і шляхецкі край [27, с. 119] (гэту ідэю чытач знойдзе і ў творах У. Караткевіча). Аднак, нягледзячы на тое, што ва ўсіх названых раманах у той ці іншай ступені адлюстраваны гістарычныя падзеі, ніводны з іх не разглядаецца сёння як гістарычны раман – верагодна, таму, што асноўная прыкмета гэтага жанру – стварэнне аўтарам канцэпцыі мінулага як асноўнай мастацкай задачы твора [28, с. 12]. А такая ідэя знайшла сваё ўвасабленне менавіта ў раманах У. Караткевіча: «Задачу стварэння мастацкай гісторыі беларускага народа, пастаўленую В. Ластоўскім, М. Гарэцкім, К. Чорным, на практыцы ажыццявіў У. Караткевіч. У асэнсаванні мінулага Караткевіч засвоіў прынцыповы ўхіл на даследаванне не сацыяльна-палітычнай гісторыі, не барацьбы розных класавых сіл, што наглядалася ў Чарнышэвіча і Лобана, а на спасціжэнне нацыянальнага свету і індывідуальнага чалавечага лёсу на фоне гістарычнай эпохі» [27, с. 119–120].

Даследчыкі аднагалосна прызнаюць У. Караткевіча **пачынальнікам** беларускага гістарычнага рамана, і, думаецца, гэта звязана перш за ўсё з тым, што ён напісаў першыя творы пра беларускую гісторыю, **масава данесеныя да чытача** (хоць храналагічна ім папярэднічалі гістарычныя творы В. Ластоўскага, Б. Мікуліча, Я. Дылы). Пісьменнік У. Арлоў зазначыў: «Заснавальнікам жанру гістарычнай раманістыкі ў нас традыцыйна лічыцца Уладзімір Караткевіч. Між тым Дылу належыць напісаны значна раней раман "На шляху з варагаў у грэкі" – твор, шмат у чым наватарскі: пазбаўлены лінейнай пабудовы, скіраваны на асэнсаванне не асобных падзей, а самога гістарычнага працэсу. І, дарэчы, дагэтуль незнаёмы чытачу»[3] [29] (раман «На шляху з варагаў у грэкі» быў напісаны Я. Дылам на вокладках старых часопісаў у другой палове 1940-х гг. у Саратаве, куды пісьменнік быў сасланы пасля арышту па фіктыўнай справе «Саюза вызвалення Беларусі»).

Аднак У. Караткевічу не проста гістарычна «пашанцавала» ў тым, што яго творы здолелі дайсці да чытача. Як заўважыла даследчыца Т. Грамадчанка, У. Караткевіч стаў першапраходцам не толькі таму, што ў папярэднія дзесяцігоддзі быў мацнейшы ідэалагічны прэсінг, але яшчэ і дзякуючы асаблівасці таленту пісьменніка – здольнасці паэтызаваць мінулае, маляўніча апісваць яго [30, с. 177]. На гэту ж акалічнасць звяртала ўвагу А. Бязлепкіна ў артыкуле «Авантурызацыя гісторыі» [31]. Творы У. Караткевіча займелі папулярнасць у чытацкай аўдыторыі яшчэ на этапе часопісных публікацый, і гэта адбылося дзякуючы здольнасці пісьменніка зрабіць мінулае захапляльным – з дапамогай цікавага сюжэту, шчырай аўтарскай інтанацыі.

***Стыль і паэтыка.*** Пра сутнасць паняцця «творчы стыль» У. Караткевіч выказваўся наступным чынам: «Лепей, відаць, не скажаш, што стыль – гэта чалавек, яго густы, схільнасці і г. д. Колькі людзей, столькі і стыляў» [32, с. 103]. Пра адметнасць свайго падыходу і светабачання ён адзначаў: «Некаторыя пісьменнікі, нават дужа значныя, прыводзяць мяне ў стан дрыжыкаў абрыдлівасці менавіта праз не-

[3]Цытата прыводзіцца ў адпаведнасці з нормамі сучаснай арфаграфіі. – *М. Л.*

натуральнасць, перакручанасць, нейкую дробную, уедлівую да канца агіднасць параўнанняў і тропаў. І, наадварот, нешта накшталт "распаленай параходнай трубы, над якой увесь дзень дрыжэла і плавілася нешта найтанчэйшае, шкляное", "вострае шалясценне пальмаў", "клахтанне драздоў на каралавых арабінах" – і ахнеш ад думкі, што ўсё гэта бачыў. У гэтым, па-мойму, і ёсць найвышэйшая вечнасць. Або, калі ўжо не так, у дзікай гіпербалізацыі, у знарочыстай грубасці, у рогаце такім, што калоцяцца муры. Карацей, ува ўсім, што ёсць жыццё, а не ў дробязным і вычварным корпанні ў абрыдлівых дробязях, заўважаных адным чалавекам у толькі аднаго другога. <…> Пішу, як прывык, падпарадкоўваючыся густу, слыху, зроку» [32, с. 103]. Паэзія, эмацыянальнасць, кантраснасць – гэтыя асаблівасці светабачання складаюць энергічную «паэтыку жыццялюбства» твораў У. Караткевіча. У артыкуле «Жывое слова» С. Навумчык указваў на самае істотнае, што можа быць адзначана ў дачыненні да стылю пісьменніка: «А слова ў Караткевіча – жывое… у Караткевіча гнеў – гэта гнеў, а смех – гэта сапраўдны смех да колікаў у жываце. Гэта зусім не азначае, што ён расфарбоўвае свет у чорна-белы колер. Проста ён ніколі не хавае сваіх адносін да герояў і іх учынкаў» [19].

Акрамя таго, раманы У. Караткевіча, сінтэтычныя па сваёй жанравай прыродзе, нясуць у сабе прыкметы шматлікіх «кніжных» стылявых сістэм: раман «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» дэманструе стыль пікарэскнай [33], авантурнай і смехавой літаратуры, раман «Чорны замак Альшанскі» – традыцыі гатычнай прозы [34], «Каласы пад сярпом тваім» – рамантызму [35], «Леаніды не вернуцца да Зямлі» – спалучэнне лірычнага і эпічнага пачаткаў. Такое сумяшчэнне стыляў і напрамкаў у арганічным адзінстве было прынцыпова наватарскім у кантэксце развіцця беларускай прозы з пачатку XX ст.

## Высновы

Беларуская літаратура перыяду 1960–80-х гг. існавала ў супярэчлівых умовах: з аднаго боку, назіралася тэндэнцыя да падпарадкавання літаратурнага працэсу партыйным задачам, з другога – пасля развенчвання культу асобы Сталіна пісьменнікі набылі пэўную свабоду для самавыяўлення. Уладзімір Караткевіч працаваў у межах афіцыйнай культуры, але пры гэтым займаў даволі нонканфармісцкую пазіцыю, якую можна ахарактарызаваць як частковае дысідэнцтва або ўнутраную эміграцыю. Гэта дазволіла пісьменніку адысці ад распаўсюджаных тэм і выбудаваць свой погляд на беларускую гісторыю і ўласную сістэму каштоўнасцей для герояў сваіх твораў.

Першы этап творчасці У. Караткевіча характарызуецца супярэчлівай рэакцыяй рэцэнзентаў на яго творы: некаторыя адзначалі іх арыгінальнасць наватарства У. Караткевіча, іншыя – крытыкавалі яго за эпігонства і «абстрактны гуманізм». З прычыны шматлікіх прэтэнзій У. Караткевіч меў цяжкасці з выданнем двух першых раманаў («Леаніды не вернуцца да Зямлі», «Каласы пад сярпом тваім»). Два апошнія раманы былі прыняты больш ухвальна, не атрымалі рэзка негатыўных водгукаў. З канца 1980-х гг. пачаў змяняцца статус пісьменніка: з «нонканфарміста» ёнператварыўся ў «нацыянальнага прарока». Пры гэтым, нягледзячы на зменлівае стаўленне крытыкаў, пісьменнік на ўсіх этапах сваёй творчасці меў трывалую падтрымку з боку чытачоў.

Раманы У. Караткевіча істотна адрозніваліся ад тагачаснай беларускай савецкай прозы тэматыкай, праблематыкай і выбарам галоўных герояў. Гэта найперш звязана з тым, што пісьменнік не імкнуўся адлюстроўваць сучаснасць, а звяртаўся да паказу падзей мінулага. У творах не проста «ўзнаўляюцца» гістарычныя падзеі – яны «нацыяналізуюцца», паказваюцца як падзеі **беларускай** гісторыі. Акрамя гэтага, закранаюцца пытанні нацыянальнай свядомасці і неабходнасці захавання нацыянальнай гісторыка-культурнай спадчыны.

Раманы У. Караткевіча характарызуюцца жанрава-стылявым сінтэтызмам. Гэта зрабіла іх арыгінальнымі ў кантэксце развіцця беларускага рамана ў 1960–80-х гг. Творчую манеру пісьменніка, якая вызначаецца інтэнсіўным выкарыстаннем і разнастайнымі спалучэннямі сродкаў вобразнасці, можна ахарактарызаваць як энергічную «паэтыку жыццялюбства».

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Дзюбайла ПК. Літаратура перыяду дэмакратычнага абнаўлення грамадства (1956–1965). Проза. У: Гніламёдаў УВ, Жураўлёў ВП, рэдактары. *Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя. Том 3*. Мінск: Беларуская навука; 2001. с. 143–157.

2. Андраюк СА. Літаратура перыяду 1966–1985 гадоў. Проза. У: Гніламёдаў УВ, Лаўшук СС, рэдактары. *Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя. Том 4, кніга 1*. Мінск: Беларуская навука; 2002. с. 8–32.

3. Караткевіч У. *Збор твораў. Том 6. Леаніды не вернуцца да Зямлі (раман амаль што сентыментальны)*. Мінск: Мастацкая літаратура; 2014.

4. Лявіцкі А. Да пытання пра ўнутраную эміграцыю беларускіх інтэлектуалаў у БССР (1964–1985). *Беларускі гістарычны агляд* [Інтэрнэт]. 2013;20(1–2) [працытавана 1 красавіка 2018]. URL: http://www.belhistory.eu/anton-lyavicki-da-pytannya-pra-%D1%9Enutranuyu-emigracyyu-belaruskix-intelektuala%D1%9E-u-bssr-1964%E2%80%931985.

5. Кажамякін Г. Леаніды вяртаюцца. У: Караткевіч У. *Збор твораў. Том 6. Леаніды не вернуцца да Зямлі*. Мінск: Мастацкая літаратура; 2016. с. 376–383.

6. Мальдзіс А. *Жыццё і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча: партрэт пісьменніка і чалавека. Літаратуразнаўчае эсэ*. Мінск: Літаратура і Мастацтва; 2010.

7. Макмілін А. *Беларуская літаратура ў 50–60-я гг. XX ст*. Мінск: Беларускі кнігазбор; 2001.

8. Верабей А. *Уладзімір Караткевіч: жыццё і творчасць*. Мінск: Беларуская навука; 2005.

9. Ермолович М. Колосья созрели для жатвы. *Нёман*. 1975;10:168–172.

10. Киселев Г. О романе «Колосья под серпом твоим» и его авторе. В: Короткевич В. *Колосья под серпом твоим*. Москва: Художественная литература; 1974. с. 3–9.

11. Банцэвіч ПК. *Творчасць Уладзіміра Караткевіча ў кантэксце культуралогіі*. Гродна: ГДАУ; 2007.

12. Моретти Ф. *Дальнее чтение*. Москва: Издательство Института Гайдара; 2016.

13. Бугаёў Д. Рамантычны рыцар чалавечнасці. *Полымя*. 2000;11:155–175.

14. Навіцкая В. Уладзімір Караткевіч і рамантызм: да праблемы літаратуразнаўчай трактоўкі творчага метаду пісьменніка. В: Боровко ВЮ, Лапатинская ОВ, Гладкова АА, Сенькова ОФ, составители. *Аксиологический диапазон художественной литературы. Материалы международной научной конференции; 23–24 марта 2017 г.; Витебск, Беларусь*. Витебск: ВГУ имени П. М. Машерова; 2017. с. 227–230.

15. Алешкевич В. Каждая книга – часть жизни [интервью]. В: Караткевіч У. *Збор твораў. Том 14. Публіцыстыка. Эсэ-нарысы*. Мінск: Мастацкая літаратура; 2016. с. 212–215.

16. Мацюхіна ТБ. Неарамантызм у творах сучасных беларускіх аўтараў: праблемы рэцэптыўнай эстэтыкі (на прыкладзе творчасці У. Караткевіча, Л. Рублеўскай, В. Шніпа). У: Козлов АВ, редактор. *Літератури світу: поетика, ментальність і духовність*. Кривій Ріг: Криворізький державний педагогічний університет; 2014. Випуск 3. с. 205–212.

17. Сцяпанава А. Рысы еўрапейскага постмадэрнізму ў творах Уладзіміра Караткевіча. У: Шкурко Т, Верабей АЛ, Карпіньскі Ц, Мальдзіс АІ, Уладыкоўская-Канаплянік ЛМ, рэдактары. *Уладзімір Караткевіч і яго творчасць у еўрапейскім культурным кантэксце*. Мінск: Беларускі кнігазбор; 2000. с. 58–62.

18. Якаўлева Г. Паслужу да канца [інтэрв'ю]. У: Караткевіч У. *Збор твораў. Том 14. Публіцыстыка. Эсэ-нарысы*. Мінск: Мастацкая літаратура; 2016. с. 205–208.

19. Навумчык С. Жывое слова: нататкі аб творчасці У. Караткевіча. *Віцебскі рабочы*. 1983. 1 верасня. с. 4.

20. Гройс Б. Истина искусства. *Художественный журнал* [Интернет]. 2015;96 [процитировано 1 апреля 2018 г.]. URL: http://moscowartmagazine.com/issue/18/article/266.

21. Шынкарэнка ВП. *Пад ветразем дабра і прыгажосці: жанрава-стылявыя асаблівасці прозы Уладзіміра Караткевіча*. Мінск: Навука і тэхніка; 1995.

22. Ягоўдзік У. Найперш – судзіць чытачу [інтэрв'ю]. У: Караткевіч У. *Збор твораў. Том 14. Публіцыстыка. Эсэ-нарысы*. Мінск: Мастацкая літаратура; 2016. с. 224–225.

23. Караткевіч У. Дарога, якую прайшоў. У: Караткевіч У. *Збор твораў. Том 13. Публіцыстыка*. Мінск: Мастацкая літаратура; 2016. с. 5–11.

24. Караткевіч У. *Збор твораў. Том 10. Чорны замак Альшанскі*. Мінск: Мастацкая літаратура; 2016.

25. Мисик МА. Метанарратив. *Исторический проект «Хронос»* [Интернет] [процитировано 1 апреля 2018 г.]. URL: http://ponjatija.ru/node/13290.

26. Дубин БВ. *Семантика, риторика и социальные функции «прошлого»: к социологии советского и постсоветского исторического романа*. Москва: ГУ ВШЭ; 2003.

27. Бароўка ВЮ. *Мастацкае народазнаўства ў беларускай літаратуры XX стагоддзя (на матэрыяле прозы)*. Віцебск: ВДУ імя П. М. Машэрава; 2009.

28. Комаровская ТЕ. *Проблемы поэтики исторического романа США XX века*. Минск: БГПУ; 2004.

29. Арлоў У. Язэп Дыла. *Радыё Свабода* [Інтэрнэт] [працытавана 1 красавіка 2018 г.]. URL: https://www.svaboda.org/a/769466.html.

30. Грамадчанка ТК. *Сучасны беларускі раман: дынаміка жанру*. Мінск: БДПУ; 2006.

31. Бязлепкіна А. Авантурызацыя гісторыі. *Полымя*. 2009;5:155–157.

32. Караткевіч У. Задума: узнікненне і ўвасабленне. Эсэ-ліст. У: Караткевіч У. *Збор твораў. Том 14. Публіцыстыка. Эсэ-нарысы*. Мінск: Мастацкая літаратура; 2016. с. 97–107.

33. Барысеева АА. Традыцыі пікарэскнага рамана ў творчасці Рамэна Гары і Уладзіміра Караткевіча. У: Рагойша ВП, рэдактар. *Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай. Матэрыялы IX Міжнароднай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 70-годдзю філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта; 15–17 кастрычніка 2009 г.; Мінск, Беларусь. Частка 2*. Мінск: БДУ; 2010. с. 226–230.

34. Бурдзялёва ІА. Традыцыі гатычнага рамана і меладрамы ў дэтэктыўнай прозе У. Караткевіча. У: Баранова НП, редактор. *Материалы ежегодной научной конференции преподавателей и аспирантов універсітэта; 22–23 апреля 2008 г.; Минск, Беларусь. Часть 5*. Минск: МГЛУ; 2009. с. 5–9.

35. Конан І. Традыцыі еўрапейскага рамантызму ў творах Г. Сянкевіча і У. Караткевіча. У: Максімовіч ВА, рэдактар. *Сучасная беларуская літаратура і працэсы славянскага культурнага цывілізацыйнага ўзаемадзеяння. Матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі; 28 мая 2008 г.; Мінск, Беларусь*. Мінск: Права і эканоміка; 2008. с. 99–102.

## References

1. Dzjubajla PK. [The literature of the society democratic renewal period (1956–1965). The prose]. In: Gnilamjodaw UV, Zhurawljow VP, editors. *Gistoryja belaruskaj litaratury XX stagoddzja. Tom 3* [History of Belarusian literature of the XX century. Volume 3]. Minsk: Belaruskaja navuka; 2001. p. 143–157. Belarusian.

2. Andrajuk SA. [The literature of the 1966–1985 years. The prose]. In: Gnilamjodaw UV, Lawshuk SS, editors. *Gistoryja belaruskaj litaratury XX stagoddzja. Tom 4, kniga 1* [History of Belarusian literature of the XX century. Volume 4, book 1]. Minsk: Belaruskaja navuka; 2002. p. 8–32. Belarusian.

3. Karatkevich U. *Zbor tvoraw. Tom 6. Leanidy ne vernucca da Zjamli* [Collected works. Volume 6. Leanidy will not return to the Earth]. Minsk: Mastackaja litaratura; 2014. Belarusian.

4. Ljavicki A. [About the issue of the inner emigration of Belarusian intellectuals in BSSR (1964–1985)]. *Belaruski gistarychny agljad* [Belarusian historical review] [Internet]. 2013;20(1–2) [cited 2018 April 1]. Available from: http://www.belhistory.eu/anton-lyavicki-da-pytannya-pra-%D1%9Enutranuyu-emigracyyu-belaruskix-intelektuala%D1%9E-u-bssr-1964%E2%80%931985/. Belarusian.

5. Kazhamjakin G. [Leanidy return]. In: Karatkevich U. *Zbor tvoraw. Tom 6. Leanidy ne vernucca da Zjamli* [Collected works. Volume 6. Leanidy will not return to the Earth]. Minsk: Mastackaja litaratura; 2016. p. 376–383. Belarusian.

6. Mal'dzis A. *Zhyccjo i wznjasenne Uladzimira Karatkevicha: partrjet pis'mennika i chalaveka. Litaraturaznawchae ese* [The life and the ascension of Uladzimir Karatkevich: the portrait of the writer and the person. Literary essay]. Minsk: Litaratura i Mastactva; 2010. Belarusian.

7. MacMillin A. *Belaruskaja litaratura w 50–60-ja gg. XX st.* [Belarusian literature in the 50–60s of the XX century]. Minsk: Belaruski knigazbor; 2001. Belarusian.

8. Verabej A. *Uladzimir Karatkevich: zhyccjo i tvorchasc'* [Uladzimir Karatkevich: life and literary works]. Minsk: Belaruskaja navuka; 2005. Belarusian.

9. Ermolovich M. [The ears ripened for the harvest time]. *Neman*. 1975;10:168–172. Russian.

10. Kiselev G. [About the novel «The ears under your sickle» and its author]. In: Karatkevich U. *Kolos'ya pod serpom tvoim* [The ears under your sickle]. Moscow: Khudozhestvennaya literature; 1974. p. 3–9. Russian.

11. Bancjevich PK. *Tvorchasc' Uladzimira Karatkevicha w kantjeksce kul'turalogii* [The literary works of Uladzimir Karatkevich in the context of culturology]. Grodna: GSAU; 2007. p. 45–91. Belarusian.

12. Moretti F. *Dal'nee chtenie* [Distant reading]. Moscow: Publishing House of Gaidar's Institute; 2016. Russian.

13. Bugajow D. [The romantic knight of humanity]. *Polymja*. 2000;11:155–175. Belarusian.

14. Navickaja V. [Uladzimir Karatkevich and romanticism: about the literary explanation problem of the writer's artistic method]. In: Borovko VY, Lapatinskaya OV, Gladkova AA, Sen'kova OF, compilers. *Aksiologicheskii diapazon khudozhestvennoi literatury. Materialy mezhdunarodnoi nauchnoi konferentsii; 23–24 marta 2017 g.; Vitebsk, Belarus'* [Axiological range of literature: a collection of the scientific articles. Materials of the International scientific conference; 2017 March 23–24; Viciebsk, Belarus]. Viciebsk: VSU named after P. M. Masherov; 2017. p. 227–230. Belarusian.

15. Aleshkevich V. [Every book is a part of life] [interview]. In: Karatkevich U. *Zbor tvoraw. Tom 14. Publicystyka. Ese-narysy* [Collected works. Volume 14. Publicism. Essays]. Minsk: Mastackaja litaratura; 2016. p. 212–215. Russian.

16. Macjuhina TB. [Neo-romanticism in the literary works of contemporary Belarusian writers]. In: Kozlov AV, editor. *Literatury svitu: poetyka, mental'nist' i duhovnist'* [The literatures of the world: poetics, mentality and spirituality]. Kryvyj Rih: Kryvyj Rih State Pedagogical University; 2014. Issue 3. p. 205–212. Belarusian.

17. Scjapanava A. [The features of European postmodernism in the works of Uladzimir Karatkevich]. In: Shkurko T, Verabej AL, Karpin'ski C, Mal'dzis AI, Uladykowskaja-Kanapljanik LM, editors. *Uladzimir Karatkevich i jago tvorchasc' u ewrapejskim kul'turnym kantjeksce* [Uladzimir Karatkevich and his works in European cultural context]. Minsk: Belaruski knigazbor; 2000. p. 58–62. Belarusian.

18. Jakawleva G. [I will serve until the end] [interview]. In: Karatkevich U. *Zbor tvoraw. Tom 14. Publicystyka. Ese-narysy* [Collected works. Volume 14. Publicism. Essays]. Minsk: Mastackaja litaratura; 2016. p. 205–208. Belarusian.

19. Navumchyk S. [The alive word: the notes about the literary works of Uladzimir Karatkevich]. *Vicebski rabochy* [Viciebsk worker]. 1983 September 1. p. 4. Belarusian.

20. Grois B. [Truth of art]. *Khudozhestvennyi zhurnal* [Art magazine] [Internet]. 2015;96 [cited 2018 April 1]. Available from: http://moscowartmagazine.com/issue/18/article/266. Russian.

21. Shynkarjenka VP. *Pad vetrazem dabra i prygazhosci: zhanrava-styljavyja asablivasci prozy Uladzimira Karatkevicha* [Under the sail of good and beauty: genre and stylistic features of Uladzimir Karatkevich's prose]. Minsk: Navuka i tjehnika; 1995. Belarusian.

22. Jagowdzik U. [To judge – for the reader] [interview]. In: Karatkevich U. *Zbor tvoraw. Tom 14. Publicystyka. Ese-narysy* [Collected works. Volume 14. Publicism. Essays]. Minsk: Mastackaja litaratura; 2016. p. 224–225. Belarusian.

23. Karatkevich U. [The way that I have passed]. In: Karatkevich U. *Zbor tvoraw. Tom 13. Publicystyka* [Collected works. Volume 13. Publicism]. Minsk: Mastackaja litaratura; 2016. p. 5–11. Belarusian.

24. Karatkevich U. *Zbor tvoraw. Tom 10. Chorny zamak Al'shanski* [Collected works. Volume 10. The Al'shanski black castle]. Minsk: Mastackaja litaratura; 2016. Belarusian.

25. Misik MA. [Metanarrative]. *Istoricheskii proekt «Khronos»* [Historical project «Chronos»] [Internet] [cited 2018 April 1]. Available from: http://ponjatija.ru/node/13290. Russian.

26. Dubin BV. *Semantika, ritorika i sotsial'nye funktsii «proshlogo»: k sotsiologii sovetskogo i postsovetskogo istoricheskogo romana* [The semantics, rhetoric and social functions of the «past»: about the sociology of the Soviet and post-Soviet historical novel]. Moscow: SUHSE; 2003. Russian.

27. Barowka VJ. *Mastackae narodaznawstva w belaruskaj litaratury XX stagoddzja (na matjeryjale prozy)* [The artistic nation-knowing in Belarusian literature of the XX century]. Viciebsk: VSU named by P. M. Masherov; 2009. Belarusian.

28. Komarovskaya TE. *Problemy poetiki istoricheskogo romana SShA XX veka* [The problems of the poetics in the USA historical novel of the XX century]. Minsk: BSPU; 2004. Russian.

29. Arlow U. Jazjep Dyla. *Radio Svaboda* [Internet] [cited 2018 April 1]. Available from: https://www.svaboda.org/a/769466.html. Belarusian.

30. Gramadchanka TK. *Suchasny belaruski raman: dynamika zhanru* [Contemporary Belarusian novel: dynamics of the genre]. Minsk: BSPU; 2006. Belarusian.

31. Bjazlepkina A. [The adventurization of history]. *Polymja*. 2009;5:155–157. Belarusian.

32. Karatkevich U. [The conception: emergence and embodiment. Essay-letter]. In: Karatkevich U. *Zbor tvoraw*. *Tom 14. Publicystyka. Ese-narysy* [Collected works. Volume 14. Publicism. Essays]. Minsk: Mastackaja litaratura; 2016. p. 97–107. Belarusian.

33. Baryseeva AA. [The traditions of picaresque novel in the literary works of Romain Gary and Uladzimir Karatkevich]. In: Ragojsha VP, editor. *Slavjanskija litaratury w kantjeksce susvetnaj. Matjeryjaly IX Mizhnarodnaj navukovaj kanferjencyi, prysvechanaj 70-goddzju filalagichnaga fakul'tjeta Belaruskaga dzjarzhawnaga universitjeta; 15–17 kastrychnika 2009 g.; Minsk, Belarus'. Chastka 2* [Slavic literatures in the context of the world literature: the materials of the 9th International conference dedicated to the 70th anniversary of the BSU philological faculty; 2009 October 15–17; Minsk, Belarus. Part 2]. Minsk: Belarusian State University; 2010. p. 226–230. Belarusian.

34. Burdzjaljova IA. [The traditions of gothic novel and melodrama in the detective prose of U. Karatkevich]. In: Baranova NP, editor. *Materialy ezhegodnoi nauchnoi konferentsii prepodavatelei i aspirantov universiteta; 22–23 aprelya 2008 g.; Minsk, Belarus'; Chast' 5* [The materials of the annual scientific conference, 2008 April 22–23; Minsk, Belarus. Part 5]. Minsk: Minsk State Linguistic University; 2008. p. 5–9. Belarusian.

35. Konan I. [The traditions of European romanticism in the literary works of G. Sjankevich and U. Karatkevich]. In: Maksimovich VA, editor. *Suchasnaja belaruskaja litaratura i pracjesy slavjanskaga kul'turnaga cyvilizacyjnaga wzaemadzejannja. Matjeryjaly mizhnarodnaj navukova-praktychnaj kanferjencyi; 28 maja 2008 g.; Minsk, Belarus'* [Contemporary Belarusian literature and the processes of the Slavic cultural civilizational interaction. The materials of the international scientific practical conference, 2008 May 28; Minsk, Belarus]. Minsk: Prava i jekanomika; 2008. p. 99–102. Belarusian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 10.04.2018.*
*Received by editorial board 10.04.2018.*